# ГЭТА НАС РАДУЕ

КАЛЕКТЫЎ Дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна з вялікай увагай сачыў за візітам Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў Злучаныя Штаты Амерыкі і ў Францыю. Мы горача ўхваляем усе пагадненні, падпісаныя ў часе перагавораў з прэзідэнтам Р. Ніксанам. Як і ўсіх савецкіх людзей, нас радуе, што гэтыя пагадненні з'яўляюцца зарукай працяглага і трывалага міру, развіцця супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў галіне эканомікі, гандлю, навукі, культуры.

Нам, бібліятэчным работнікам, асабліва блізкі артыкул VIII «Агульнага пагаднення паміж Саюзам Савецкіх Сацыялістычных рэспублік і Злучанымі Штатамі Амерыкі аб кантактах, абменах і супрацоўніцтве», які сцвярджае, што «бакі будуць заахвочваць абмен кнігамі, часопісамі, газетамі і іншымі выданнямі па навуковых, тэхнічных, культурных і агульнаадукацыйных пытаннях паміж бібліятэкамі, універсітэтамі і іншымі арганізацыямі кожнай краіны...»

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна падтрымлівае кантакты з бібліятэкамі ЗША з 1956 года. Мы вядзём міжнародны кнігаабмен з 28 амерыканскімі партнёрамі, у тым ліку з бібліятэкай Кангрэса, Нью-Йоркскай публічнай бібліятэкай, бібліятэкамі Калумбійскага, Гарвардскага, Прынстонскага, Каліфарнійскага, Канзаскага універсітэтаў. У 1972 годзе мы атрымалі са Злучаных Штатаў Амерыкі 155 кніг і 214 часопісаў, адправілі ў амерыканскія бібліятэкі 189 кніг і 378 часопісаў.

Вялікім попытам у амерыканскіх чытачоў карыстаецца беларуская мастацкая літаратура, кнігі па пытаннях філалогіі, культуры, мемуары аб партызанскім руху ў нашай рэспубліцы. Многа было запытанняў на бібліяграфічныя выданні нашай бібліятэкі. Мы высылаем таксама матэрыялы аб вопыце работы бібліятэк Беларусі, штогодныя агляды іх дзейнасці.

Пачалі завязвацца і непасрэдныя кантакты. У 1972 годзе загадчык замежнага аддзела нашай бібліятэкі І. В. Жолудзеў на стыпендыю ЮНЕСКА на працягу трох месяцаў знаёміўся з работай лепшых бібліятэк ЗША і Канады, а з 1973 года ён запрошаны і працуе ўжо ў бібліятэцы ААН. Супрацоўнік міжнароднага кнігаабмену Прынстонскага ўніверсітэта З. Давід прыязджаў у нашу бібліятэку з мэтай замацавання і далейшага развіцця кнігаабмену.

Мы спадзяёмся, што дзякуючы ажыццяўленню праграмы міру, прынятай XXIV з'ездам КПСС, эканамічнае і культурнае супрацоўніцтва паміж СССР і іншымі краінамі будзе ўсё больш расці і мацавацца.

**Э. ЦЫГАНКОЎ,**
**дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.**

# ДЗЯКУЙ!

**Вялікую цікавасць выклікаў у нашых хлебаробаў візіт Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў ЗША. Наша родная Камуністычная партыя, яе Ленінскі Цэнтральны Камітэт, асабіста Леанід Ільіч Брэжнеў робяць усё магчымае, каб умацаваць мір на нашай планеце. Няма сумнення, што сустрэча палітычных кіраўнікоў дзвюх вялікіх дзяржаў паспрыяе разрадцы міжнароднай напружанасці, умацуе дружбу і ўзаемавыгадныя сувязі паміж нашым і амерыканскім народамі.**

**Дзякуй партыі і ўраду за тое, што яны прыкладаюць так многа намаганняў, каб жахі вайны ніколі не паўтарыліся.**

**А. КУПРАЦЭВІЧ,**
**загадчык Відошынскага сельскага клуба, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.**

Жыткавіцкі раён
Гомельскай вобласці.